Шык К.І., студ. гр., 514 ФТБКіСМ
БДУ культуры і мастацтваў
Навуковы кіраўнік –Гуд П.А.,
канд. гіст. навук, прафесар

# БАЯВЫЯ І СПАРТЫЎНЫЯ АДЗІНАБОРСТВЫ БЕЛАРУСАЎ

У нашай краіне спорт і фізічная культура займаюць важнае месца у духоўным жыцці грамадзян Беларусі. Асаблівую ролю беларусы надавалі баявым і спратыўным адзінаборствам, якія можна было пабачыць на традыцыйных беларускіх святах. Раней такія адзінаборствы былі абярэгам, малітвай, сувяззю з продкамі, а пасля ператварыліся у яскравыя забавы, трэніровычныя практыванні і сталі неад'емнай часткай святочнай культуры. Нажаль на многіх сучасных святах можна пабачыць толькі ўсходнія адзінаборствы, што не спрыяе развіццю беларускай культуры і выхоўвае стэрэатып аб тым, што ў беларусаў няма сваіх баявых адзінаборстваў. Аднак калі разабрацца, то відавочна, што краіна Беларусь і беларусы са сваёй даўняй гісторыяй, выпрацавалі  баявыя адзінаборствы для абароны, а з цягам часу іх пераўтварылі ў спартыўныя. Таму вывучэнне, асэнсаванне і укараненне баявых і спратыўных адзінаборстваў  у святах мае актуальнась.

Гісторыя адзінаборстваў пачынаецца са старыжытных часоў. Розныя віды барацьбы, танцы, абрады, спевы. Усё гэта было шмат чым звязана з ваеннай традыцыяй нашых продкаў, але так называцца яны пачалі значна пазней. Тады калі стала фарміравацца войска,  а дакладней калі яно мела ўжо вялікую традыцыю праверанную часам. Усе сучасныя ваенна – прыкладныя віды спорта былі раней проста забавамі , ці трэніроўкамі перад шматлікімі войнамі.

Магутыя дасягненні у вайсковай справе падкрэсліваюць шэраг літаратурных і гістарычных кніг: "Слова аб палку Ігаравым", "Песня пра Зубра", "Турнірныя традыцыі у В.К.Л." і т.д. Нашыя войскі атрымлівалі значныя перамогі.Такія як перамога на Сініх водах, у Грунвальдзкай бітве , у Вялікай Айчыннай вайне і інш. Перамогам спрыялі шматлікія трэніроўкі, якія

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

складаліся з розных практыкаванняў. Гэтыя ваенныя практыкаванні насілі спартыўную накіраванасць. Нярэдка ваяры спаборнічалі паміж сабой. Так узніклі многія ваенныя забавы і ваенна-прыкладныя адзінаборствы.

Напрыклад у старажытныя часы , калі сустракаліся два войскі існавала традыцыя выклікаць на паядынак самых дужых волатаў , нязрэдку гэта былі ваяводы. Называўся такі паядынак “гарц”. Беларускі гісторык А.Грыцкевіч ліча, што гэтая ваенная традыцыя павінна была уразіць астатнюю масу. На мой погляд гэта былі пачаткі вайсковых спартыўных традыцый і свят. З мэтай падрыхтоўкі свайго войска ў гады ўздыму В.К.Л., князь Вітаўт ствараў цэнтры падрыхтоўкі асілкаў. Вось як гэта апісвае Мікола Гусоўскі ў паэме “Песня пра Зубра” :

*У княжанне Вітаўта ў годы найвысшага ўздыму*
*Боегатоўнасці будучых рэкрутаў з вёсак*
*Князь і загадваў ствараць у сваіх уладаннях*
*Лагер ваенны пры кожным паселішчы ў пушчах,*
*Дзе рыхтаваў свае раці да бітваў наступных.*

Мікола Гуксоўскі шмат чаго адзначаў у сваёй паэме з падрыхтоўчых этапаў ваяроў. Напрыклад паляванне, як адпрацоўка ваеннага майстэрства, спрыту, мужнасці, сілы ў рэальных абставінах.

*Паляванне-лепшы бальзам падупаламу целу і духу.*
*І гартаванне , што старасці бледную немач*
*Не падпускае , трымачы дзесці навводаль.*
*Лепшая практыка воку , лякарства для вуха –*
*Высачка звера з яе пастаянным дазорам.*

Гэтыя радкі падкрэсліаюць тое што толькі той, хто трэніраваўся, мог дасягнуць сапраўдных вяршыняў. Сам аўтар таксама добра ведаў ваенную справу, бо яго бацька быў баярынам-заможным селянінам які да шляхты не адносіўся, але выконваў службовыя абавязкі (ваенная павіннасць, язда ганцамі, удзел у паляванні і інш.) Таму Мікола Гусоўскі з маленства дапамагаў бацьку і таму жыццё яго праходзіла з лукам , канём і ў паляванні :

*Змалку ад бацькі вучыўся ў бясконцых абходах*
*Крокам нячутным ступаць , каб нішто не шурхнула…*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Колькі патоў ён, бывала , зганяў з мяне ў зімнюю сцюжу,*
*Коп'і шыбаць прымушаючы з егу наводмаш!*
*Колькі нагледзеўся смерці , наслухаўся енку*
*У пушчах , пакуль мяне , сына , вучыў палясоўшчык.*

Вось так адбывалася раней трэніроўка, амаль нічым не адрозневаецца ад сучаснай. Дарэчы паводле Гусоўскага баявая падрыхтоўка уключала ў сябе конныя гонкі, у тым ліку і начныя, фарсіраванне рэк і т.д. Пераможцаў унагароджвалі прызамі. Што яшчэ раз пакрэслівае сувязь з сучасным спортам.

Аднак развіццё гэтых відаў спорту не абмежавалася часамі Вітаўта. Наадварот традыцыі вялікага князя ўкараніліся, а яшчэ і удасканаліліся. Акрамя трэніровак і паляванняў, з'явіліся гульні спаборніцтвы якія ўжо мелі дзяржаўны маштаб. У XII ст. ў Францыі з'яўляюцца рыцарскія турніры, якія таксама з поспехам праходзілі і ў нас. Рыцарскі турнір гэта своеасаблівая гуляня , дзе рыцар пасля бою абавязкова выбіраў сабе даму сэрца.Са з'яўленнем пораху і стрэльбаў , з'явіліся і піратэхнічныя дзеянні. Стральба не толькі з лукаў і арбалетаў, а яшчэ і з ружжаў. Піратэхнічныя дзеі ўпрыгожылі і ўзбагацілі ўсе святы якія прыкладна XVI ст. і адбываюцца зараз. У статуце Слуцка 1621 г. князь Крыштаф Радзівіл запісаў , " каб на вучэбных штогодніх стрэльбах прысутнічалі стараста княства (намеснік князя), капітан (камендант крэпасці) і войт, якія былі і суддзямі гэтых стралковых спаборніцтваў. Яны вызначалі лепшых стралкоў. Калі ў цэль пападалі многія, то прыходзілася страляць ізноў, за выключэннем трох лепшых стралкоў. Пераможцаў урачыста абвяшчаў суддзя, ім выдавалі атэстаты".[8,с.28]

Потым такіяж спаборніцтвы наладжваліся у XVIII ст.у Слуцку, Быхаве і Нясвіжы і называліся "кароль курка". Пераможца на год атрымліваў званне "караля " спаборніцтваў. З гэтага мы бачым , што спаборніцтвы насілі ваенна-прыкладны характар, а таксама былі вельмі відовішчнымі, што давала ім магчымасць ствараць асаблівы і непаўторны каларыт.

Сярод свецкіх забаў шляхты былі і такія спартыўныя дзеянні , як конныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

каруселі. Насілі яны таксама і ваенны накірунак. У XVII-XVIII ст. “каруселі” прыйшлі на змену рыцарскім турнірам. У конных каруселях удзельнічалі чатыры групы вершнікаў (банды , кадрылі), якія павінны былі прайсці пэўныя выпрабаванні: напрыклад патрапіць шабляй у пярсцёнак ці ў цэль куляй. Само дзеянне складалася з некалькіх эпізодаў. Абавязковымі быў парад вершнікаў і фінал, дзе адбывалася ўзнагароджванне пераможцаў. Распаўсюдзіў гэтую забаву на землях В.К.Л. магнацкі род Радзівілаў. Каруселі пакінулі значны след у нашай гісторыі. Таксама ацаніўшы гэтае святочнае мерапрыемства, якое праводзілася як самастойная забава, так і ўваходзіла у цэлы комплекс мерапрыемства прысвечаных нейкім падзям. Такім чынам можна зрабіць выснову, што конныя каруселі насілі тыпова ваенна-прыкладны спартыўны характар з элементамі шоў. З усяго вышэй сказанага можна зрабіць выснову, што беларусы мелі сваю ўласную традыцыю баявых і спартыўных адзінаборстваў, якія былі вельмі відовішчны і нават насілі святочны характар з элементамі шоў.Таму сучасным рэжысёрам варта ствараць святы на аснове гістарычных трыдыцыях, бо такія святы спрыяюць выхаванню моладзі і нацыі ў накірунку захавання здаровага ладу жыцця, а таксама павагі і любові да Радзімы.

Літаратура:


1. Бохан Ю.М. “Турнірныя традыцыі ў ВКЛ ў XV-XVI ст.
2. Гусоўскі Мікола “Песня пра Зубра”
3. Гуд П.А . “Мастацтва феерверкаў” Мінск 2007

Мандзяк А.С. “Боевые искусства Европы” Минск 2005


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ